**ПЕРВЫЙ КЛИП “VAVILONA”, или “Мы играем классический рок...”** 2



**АЛЕКСАНДР ПУКАЛО: “Профессия выбрала меня...”** 3



**КАК Я БЫЛ АМЕРИКАНЦЕМ, или Ностальгия вернула меня на Родину** 14




Выдавец УП “Газета для вас”

Выдаецца са студзеня 1997 года на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — адзін раз на тыдзень

# ГАЗЕТА ДЛЯ ВАС

ІВАЦЭВІЧЫ-БЯРОЗА-ПРУЖАНЫ-ДРАГІЧЫН
(Брэсцкая вобласць)

№ 32 (710) 7 жніўня 2009 г., пятніца

Кошт свабодны (у розніцу)





# ХАЦЕЛІ ЯК ЛЕПШ, А АТРЫМАЛАСЯ ЯК ЗАЎСЁДЫ!

## Як царкву ў вёсцы Гошчава адрамантавалі...

**Крыжаўзвіжанская царква ў вёсцы Гошчава (Івацэвіцкі раён) занесеная ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Гэтая ладная, прысадзістая, але дзівосна гарманічная цэркаўка была збудаваная ў 1838 годзе. Бачыла войны, бачыла саветы. Выстаяла. Сёлета царкву вырашылі адрамантаваць. Добрая задума — немалады ж будынак. Але што за рамонт робяць з далікатным старым дрэвам?**

Помнік драўлянага дойлідства патынкавалі. У вокны ўставілі шклопакеты. На даху з’явіліся купалы-цыбуліны ў маскоўскім стылі. Больш за тое, адзін купал паўстаў там, дзе яго не было. Тамбур нарасцілі з выкарыстаннем сілікатных блокаў. А адпорціка з падвойнымі фігурнымі калонамі, што так густоўна вылучаў галоўны ўваход, не засталося і следу. Што і гаварыць пра такую драбніцу, як паўцыркульныя вокны з разнымі ліштвамі, дзякуючы якім царква нібы жывая пазірала на кожнага, хто падыходзіў да яе з фасаду. Далоў і іх.

У ходзе рамонту “непапраўна змяняецца яе знешні выгляд, канструкцыі, мастацка-архітэктурнае аздабленне, што з’яўляецца парушэннем арт. 27; 28; 29; 32; 33; 36; 37; 45 Закона “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь” ад 9 студзеня 2006 г.” — піша ў звароце да Міністэрства культуры старшыня Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Астаповіч. Ён адзначае, што “практыка несанкцыянаваных працаўна гісторыка-культурных каштоўнасцях, змянення іх канструкцый і выгляду, у некаторых выпадках знішчэнне помнікаў, на жаль, яшчэ сустракаецца ў Беларусі”.

Спадар Астаповіч лічыць, што “перашкодзіць гэтаму павінна жорсткая пазіцыя Міністэрства культуры”.

З адпаведным зваротам А. Астаповіч звярнуўся таксама ў пракуратуру Івацэвіцкага раёна.

Таварыства аховы помнікаў хадайнічае пра завядзенне крымінальнай справы паводле ч. 2 арт. 344 КК (наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне гісторыка-культурных каштоўнасцяў або матэрыяльных аб’ектаў, якім можа быць прысвоены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці) ў адносінах да ўласніка гісторыка-культурнай каштоўнасці, заказчыка і падрадчыка нерэгламентаваных рамонтных прац на дадзеным аб’екце, і паводле арт. 428 (Службовая халатнасць) у дачыненні да ўпаўнаважаных супрацоўнікаў выканаўчай улады ў галіне кантролю за выкананнем заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

●

Ва Упраўленні па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры заявілі, што праект рэканструкцыі царквы ў Гошчаве не ўзгадняўся з Мінкультуры.

У Стайкаўскім сельсавеце, да якога належыць вёска Гошчава, ад каментарыяў адмовіліся, параіўшы звяртацца напрост да святара айца Аляксандра. Але адшукаць яго не ўдалося. “Цяжка нешта на гэтую тэму каменціраваць”, — кажа галоўны архітэктар Івацэвіцкага раёна Святлана Грушык. Па яе словах, а. Аляксандр робіць рамонт самастойна. Знайшоў сабе спонсара, прыватную асобу, які яму і дапамагае. На пытанне, ці ўзгадняліся гэтыя работы з ёй, як з галоўным архітэктарам раёна, быў адмоўны адказ.

**Сямён ПЕЧАНКО.**
**Івацэвіцкі раён.**

**P. S.** Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей РБ — спіс аб’ектаў архітэктуры, гісторыі, археалогіі, мастацтва, паркавыя комплексы, музейныя калекцыі і кнігі, якія знаходзяцца пад дзяржаўнай аховай. У гэты спіс уваходзяць каля 5 тысяч аб’ектаў па ўсёй краіне, з іх 38 размешчаны на тэрыторыі Івацэвіцкага раёна. Усе гэтыя каштоўнасці падзелены на 4 катэгорыі. Палац Пуслоўскіх каля г. Косава адносіцца да першай катэгорыі (міжнароднае значэнне). Царква ў в. Гошчава адносіцца да трэцяй катэгорыі (рэгіянальнае значэнне).



А. Дыбоўскі.

Царква да рамонту.



globus.tut.by.

Царква пасля еўрарамонту.


**Запчасти для иномарок**
элементы подвески, колодки, амортизаторы, запчасти двигателя, фильтры, масла, свечи



Тел. 8-029-192-20-56
*В наличии и под заказ*
Свид. № 0199617 от 08.06.2009 г. Ивацевичским РИК. УНН 290833571

ЧПТУП “Манитоба”
**Выполним наружную и внутреннюю отделку в г. Ивацевичи**
Благоустройство
**Кровля. Термошуба.**
Требуются на работу отделочники.
Тел. 8-029-791-86-93
8-(01645) 2-71-49
Свид. №0794 от 27.12.2007 г. Брестским ОИК. УНН 290485569



**КНА SALAMANDER**
*СЕРТИФИКАТ КАЧЕСТВА*
*НЕМЕЦКАЯ КОМПЛЕКТАЦИЯ*
*ИНДИВИДУАЛЬНЫЙ ПОДХОД*
*ПРОФЕССИОНАЛЬНАЯ КОНСУЛЬТАЦИЯ*
*ДВЕРИ ПВХ*
*ТЕПЛЫЕ БАЛКОНЫ*
*МОСКИТНЫЕ СЕТКИ*
МТС. 8-029-723-47-33
VEL. 8-029-126-48-17
*ОЩУЩЕНИЕ ДОМА-ОЩУЩЕНИЕ КОМФОРТА*
Свид. № 200425557 от 18.08.2000 г. Ивацевичским РИК УНН 290344728

# “VAVILON”, или “Мы играем классический рок...”

**БЕЛООЗЕРСК. Этим мальчишкам никогда не бывает скучно — у них на это просто нет времени. Знакомьтесь: молодежная музыкальная группа “Vavilon” — барабанщик Алексей Ковалевич, бас-гитара Тимур Чернявский, гитара-вокал Андрей Гарапучик, соло-гитара и бэк-вокал Саша Мижнюк.**

Все четверо давно знают друг друга, а объединяет их любовь к музыке. Группа “Vavilon” еще пока не очень известна за пределами города Белоозерска, но у ребят все еще впереди, тем более, что они делают уверенные шаги вперед. В тот день, когда мы с ними разговаривали, они уезжали по приглашению на концерт в Дрогичинский район.

Группе скоро исполнится 2 года. Мальчишки хорошо помнят то волнение, которое испытывали, выходя на сцену в первый раз. А было это в Доме культуры Белоозерска. Первые слушатели и критики — родители. Они, кстати, все это время помогают и поддерживают ребят, приобретают необходимое оборудование и инструменты. Стихи и музыку к своим песням ребята пишут сами, а также исполняют песни из репертуара группы “Кино”, которую считают кумирами.

На песню “Дождь” друзья помогли снять клип. О съемках рассказывали со смехом. По сценарию, действие происходит на восходе солнца на крыше дома. Выбрали в городе дом и в 4 утра стали таскать на крышу инструменты. Можно только представить “восторг” спящих жителей, когда на рассвете их разбудили звуки рок-музыки. Кроме того, по сценарию песни девушка стоит на краю крыши. Проснувшиеся жители решили, что дети хотят броситься с крыши и немедленно вызвали милицию. Потом были протоколы, объяснительные, но снять клип успели. Сейчас все желающие могут посмотреть его в интернете в Google: “Vavilon” “Дождь”.



Светлана БРЕНКОВИЧ.

“Vavilon” — группа из Белоозерска.

Кроме музыки ребята любят спорт. Являются приверженцами здорового образа жизни. У каждого есть свои любимые предметы в школе. При возможности с удовольствием путешествуют с родителями. Верят, что когда-нибудь будут выступать с известными музыкальными группами, а пока ищут спонсоров, чтобы выпустить свой первый альбом, для которого готовы 10 песен на русском и белорусском языках. Здорово, что в столь юном возрасте мальчишки уже многое успели сделать, а при желании добьются того, о чем мечтают. Удачи им всем!

**Светлана БРЕНКОВИЧ.**

# НеКультура бытия

**БЕРЕЗА. Не так давно жители города были свидетелями торжественного открытия большого фонтана в Старинном парке. В этом месте сейчас многолюдно и днем, и вечером. В летнюю жару ребятня мочит ноги в его холодных струях, а мамы с колясками отдыхают в тени деревьев. И только работникам коммунальных служб добавилось забот.**

Если во всем мире в фонтаны бросают монетки, то наши жители считают, что обертки от мороженого и чипсов с лихвой их заменят. Вот и вылавливают коммунальщики, особенно после выходных дней, из фонтана мусор. Очень схожая проблема существует и в городе Белоозерске, где в городском сквере горит Вечный огонь. Не раз сама была свидетелем того, как мальчишки и девчонки бросают в него мусор и наблюдают, как он горит. Им весело и смешно, и они совсем не задумываются над тем, в каком месте они это делают. На мой вопрос, знают ли они, почему здесь горит огонь, они недоуменно пожимали плечами. Считаю, что вина в этом школы и родителей — объяснять нужно детям. Вспоминая себя в этом возрасте, хорошо помню, что было большой честью в важные государственные праздники стоять в пионерском карауле у памятника погибшим летчикам и у Вечного огня. Мы четко знали, кому посвящен этот огонь. Проходит время, меняются ценности, но что-то ведь да остается! Чувство патриотизма, культура поведения в общественных местах закладывается в человеке с детства. Получается, что не всем дано...

**Светлана БРЕНКОВИЧ.**

# Рядом с человеком



**БЕРЕЗА. Семейство белых лебедей — это старые добрые друзья маленького озерка в районе Северного городка в Березе. Несмотря на то, что рядом протекает Ясельда и есть еще одно небольшое озерко, эта пара белых красавцев живет там, где отдыхают люди, где плещется шумная детвора. Горожане подкармливают птиц хлебом .**

За последние несколько лет лебеди стали неотъемлемой частью весенне-летнего пейзажа. Кстати, неожиданно для себя узнала, что лебеди отличаются сильной привязанностью к месту гнездования, и, найдя однажды для себя место, к нему возвращаются практически всегда. Сегодня горожане, приходящие к озерку, наблюдают, как подрастает потомство у этой красивой пары — три серых пушистых “утенка”, которые к осени станут такими же красивыми, как мама и папа — белыми и грациозными.

**Светлана БРЕНКОВИЧ.**

# Сертификат — заводу

**БЕРЕЗА. Приятное известие недавно получили сотрудники Белоозерского энергомеханического завода филиала РУП “Брестэнерго” — заводу вручен сертификат соответствия о внедрении системы менеджмента качества по стандарту ISO 9001.**

Завод ждет коренная реконструкция энергетического оборудования, т. к. на ремонт оборудование поступает от партнеров из России, Украины, Чехии, Германии, Финляндии, Швеции.

**Светлана БРЕНКОВИЧ.**

# Падазраецца начальнік СПМК-132

**У Брэсце распачата крымінальная справа ў дачыненні да начальніка УП “БрэсцкаяСПМК-132”, які падазраецца ў перавышэнні ўлады або службовых паўнамоцтваў.**

Як паведаміў памочнік пракурора Маскоўскага раёна Брэста Эдуард Пашкевіч, справа распачата 4 жніўня пракуратурай Маскоўскага раёна Брэста. Начальнік прадпрыемства падазраецца ў тым, што ў студзені гэтага года падчас правядзення адкрытых таргоў на пастаўку будаўнічых матэрыялаў для будаўніцтва птушкафабрыкі ў вёсцы Прыборава, якое фінансуецца за кошт крэдытных сродкаў Нацыянальнага банка, даў указанне членам конкурснай камісіі аб адхіленні найбольш выгаднага прэтэндэнта і прызнанні пераможцам таргоў замежнага прыватнага прадпрыемства, размешчанага ў Мінскім раёне.

Гэтымі дзеяннямі кіраўніка СПМК быў прычынены ўрон дзяржаве на суму больш чым 300 млн. рублёў.

**БелаПАН.**

# У пенсіённай сістэме будуць змены?

**Да канца гэтага года Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі плануе падрыхтаваць і ўнесці ў Савет міністраў пакет законапраектаў аб дзяржаўным пенсіённым страхаванні і дзяржаўных страхавых пенсіях, а таксама аб дзяржаўным пенсіённым забеспячэнні.**

Пакет законапраектаў прадугледжвае структурныя змяненні ў пенсіённай сістэме, у тым ліку пераход да вылічэння пенсій з аб'ёму пенсіённых узносаў работніка (увядзенне ўмоўна-накапляльных рахункаў). Усяго на 1 ліпеня ў Беларусі розныя віды пенсій атрымлівалі 2 млн. 453,9 тыс. грамадзян.

**Анастасія ЯНУШЭЎСКАЯ.**

# Август: теплее нормы

**Средняя месячная температура воздуха в августе 2009 года ожидается на 1°С выше климатической нормы.**

**Месячное количество осадков в августе 2009 года предполагается в пределах средних многолетних значений.**

Средняя месячная температура воздуха в августе (климатическая норма) составляет от +16 до +17°С. Температура воздуха днем в последний месяц лета в среднем находится в пределах от +21°С до +24°С, ночью — от +10°С до +13°С. Абсолютный максимум температуры воздуха отмечен в 1946 году и составил +38°С.

В среднем в августе бывает от 11 до 15 дней с дождем и выпадает 62—89 мм осадков (климатическая норма). Максимальное количество осадков за сутки (146 мм) зафиксировано в 1970 году.

Следует учитывать, что прогноз погоды на месяц носит вероятностный характер и точность его невелика. Прогнозы погоды на месяц уточняются прогнозами погоды на 2—3 дня и на сутки.

**pogoda.by.**

# Юлія Юрэня — пераможца

## Еўрапейскага алімпійскага фестывалю моладзі

**ІВАЦЭВІЧЫ. 22 ліпеня на Еўрапейскім алімпійскім фестывалі моладзі ў фінскім горадзе Тампера спартсменка з г. Івацэвічы Юлія Юрэня заваявала залатую медаль за зборнай Беларусі.**



Юлія Юрэня (на здымку — злева) стала пераможцай у забегу на дыстанцыі 400 м з вынікам 53,90 сек. Яна значна апярэдзіла бліжэйшую саперніцу немку Крысціну Звірнер, вынік якой — 54,59 сек. Бронзу заваявала румынка Адэліна-Дарына Пастар (54,72). Адзначым, што беларуска ўстанавіла нацыянальны рэкорд у сваёй узроставай групе.

Трэніруецца Юлія пад кіраўніцтвам Васіля Дубойскага і Аляксандра Міхайлава. Першым яе трэнерам быў Міхаіл Сяргейчык.

**Алесь ПРЫГОДЗІЧ.**

# Пасля ДТЗ — уцек

**БАРАНАВІЧЫ. 2 жніўня 38-гадовы жыхар Ляхавіцкага раёна ў стане алкагольнага ап'янення за рулём “Масквіча” здзейсніў наезд на 65-гадовую пенсіянерку, якая пераходзіла праезную частку па пешаходным пераходзе. Вадзіцель уцёк з месца здарэння, але быў затрыманы.**

Дарэчы, за мінулыя выхадныя ў Беларусі ў ДТЗ загінулі 14 чалавек, у тым ліку адно дзіця. 57 чалавек, у тым ліку трое дзяцей, атрымалі раненні.

Дзяржаўтаінспекцыя заклікае грамадзян быць дысцыплінаванымі, адказнымі і не садзіцца за руль пасля ўжывання алкаголю.

**Анастасія ЯНУШЭЎСКАЯ.**

# Попал под гусеницу

**БЕРЕЗА. Тракторист ПМК, 1953 года рождения, житель д. Сигневичи Березовского района, попал под гусеницу начавшего движение трактора и от полученных телесных повреждений скончался.**

Произошло это 30 июля в 15.20 на территории строительного объекта “Крахмальный завод” в д. Сигневичи Березовского района. При запуске двигателя мужчина не убедился, что трактор “Т-170” снят с передачи.

Проверку проводит прокуратура.

**Ирина ГОНЧАРОВА.**

# Чарговы суіцыд

**ІВАЦЭВІЧЫ. Апошнім часам горад жахаецца здарэннямі, якія пазбаўляюць людзей жыцця. Вось і на мінулым тыдні звяла рахункі з жыццём 62-гадовая пенсіянерка. Што здарылася з жанчынай, чаму жыццё стала невыносным, напэўна, ведае толькі яна.**

Вядома толькі, што ў свой час яна прадала сваю кватэру і жыла с сынам і нявесткай.

**Алесь ПРЫГОДЗІЧ.**

Александр ПУКАЛО:

# “ПРОФЕССИЯ ВЫБРАЛА МЕНЯ...”

## 9 августа — День строителя

**Впервые официально День строителя отметили 12 августа 1956 года. Этому предшествовал выход Указа Президиума Верховного Совета СССР “Об установлении ежегодного праздника Дня строителя” от 6 сентября 1955 года. Отмечать его предписывалось каждое второе воскресенье августа. Эта традиция сохранилась и до сегодняшнего дня.**


Ирина ГОНЧАРОВА.

Как и у любого праздника, у Дня строителя есть свои традиции: сдача новых объектов, награды к празднику, торжественные заседания с участием представителей властных структур и т. д.

Сложна ли эта профессия и чем она актуальна? Об этом наша беседа с начальником ГУП “Ивацевичская ДСПМК-34” Александром Николаевичем Пукало.

**— Насколько мне известно, Вы прошли путь от прораба до начальника солидной строительной фирмы. Почему Вы отдали предпочтение именно этой профессии?**

— Когда я заканчивал школу, я не задумывался, какую профессию буду приобретать. С гуманитарными науками я не очень “дружил”, сочинения вообще не умел писать, мне намного легче давалась математика. Поэтому я решил поступать в технический ВУЗ. И ближайшим был Брестский инженерно-строительный институт. После окончания института меня направили работать в строительную организацию в г. Минск. И только тогда я понял, что выбрал профессию, которая мне по душе. В нашей семье по мужской линии уже не одно поколение работает в этой отрасли.

**— На Ваш взгляд, актуальна ли сейчас профессия строителя?**

— Она всегда была, есть и будет актуальной, так как эта профессия необходима и незаменима. Но вот с кадрами — у нас проблема. Мы уже не первый год подаем заявку на то, чтобы к нам в Ивацевичи прислали молодого инженера, но после окончания ВУЗа всех молодых специалистов распределяют в основном в более крупные города. Хочется, чтобы ВУЗы Беларуси выпускали больше квалифицированных специалистов, потому что каждый руководитель хочет, чтобы у него работали образованные работники.

**— Александр Николаевич, Вы работали во время Советского Союза. На Ваш взгляд, изменилось ли что-нибудь?**

— Конечно. Жизнь движется по всем направлениям. И разница между тем временем и сегодняшним днем — огромная. Но и в советское время было много хорошего, что незаслуженно забыли или отменили. Например, инженерная подготовка. В то время всей стройкой объекта управлял один человек — инженер. В октябре месяце всем строителям доводили план на следующий год, выделялись средства и назначались сроки сдачи объекта. Сейчас мы работаем иногда в условиях перебоев в финансировании...

**— За 30 лет своей работы Вы построили немало объектов. Есть ли такой, строительство которого Вы можете отметить?**

— Да, есть такой объект. Наша фирма строила здание школы №3 г. Ивацевичи, тогда я еще работал прорабом. У нас был назначен срок завершения работ — сентябрь месяц. Первая колонна была поставлена в феврале этого же года. Над нами многие смеялись и шутили, что будто мы слишком много берем на себя и никогда не справимся со стройкой в срок. Однако к 1 сентября объект был сдан, и мы торжественно разрезали ленточку при сдаче нового здания в эксплуатацию.

**— На данный момент над каким объектом работаете?**

— Самый крупный объект, который мы строим, — это большой агросвинокомплекс недалеко от Ружан. Он рассчитан на 50 тысяч голов. Строим молочный блок на ферме в д. Квасевичи. Проводим благоустройство во всех домах, которые строятся в городе Ивацевичи. Работаем по благоустройству агрогородков и т. д. В общем, работа есть, и немало.

**— Как вы празднуете День строителя?**

— По традиции, очень хорошо. Этот профессиональный праздник отмечают все — строители, архитекторы, проектировщики, работники промышленности стройматериалов, ветераны отрасли и ее современный кадровый состав. Я, как руководитель, стараюсь всех поздравить, всех премировать или вручить подарки. Как правило, мы стараемся все вместе собраться на праздничном концерте в городском Доме культуры.

В преддверии праздника я бы хотел поздравить всех своих коллег и работников с этим праздником. И пожелать всего самого лучшего. Еще хотелось бы, чтобы во всей нашей работе присутствовала взаимовыручка. Я считаю, что это очень важно.

**Ирина ГОНЧАРОВА.**

**г. Ивацевичи.**

# 15 лет на страже экономических интересов

**На протяжении 90 лет ведется летопись органов государственного контроля Беларуси. В далеком 1919 году был создан Комиссариат государственного контроля Временного рабоче-крестьянского Советского правительства Белоруссии, положивший начало государственному контролю в республике. С течением времени названия и структура контрольного органа менялись.**

С обретением белорусским государством независимости наступил новый этап контрольной деятельности.

2 августа 1994 года создана Служба контроля Администрации Президента Республики Беларусь (одновременно был упразднен Департамент экономического контроля). С этой даты ведет свою историю современный Комитет государственного контроля.

Впоследствии Служба контроля Администрации Президента преобразована в Службу контроля Президента Республики Беларусь, а в 1996 году — в Комитет государственного контроля.

На сегодняшний день в структуру Комитета государственного контроля Республики Беларусь входит Центральный Аппарат Комитета, Департамент финансового мониторинга (финансовая разведка), Департамент финансовых расследований, 6 областных Комитетов государственного контроля и Комитет государственного контроля по г. Минску, а также 12 межрайонных, в том числе 2 в Брестской области — Барановичский и Пинский.

На контроле и исполнении в Комитете находится 2181 поручение Главы государства, содержащееся в 504 нормативных правовых актах Президента Республики Беларусь. Сегодня наша деятельность направлена на обеспечение экономической безопасности государства, выявление неиспользуемых резервов повышения эффективности экономической деятельности.

Барановичским межрайонным комитетом государственного контроля Брестской области за 6 месяцев 2009 года проведена 31 проверка. По сравнению с аналогичным периодом прошлого года их количество снижено в 2 раза. В то же время сумма наложенных административных взысканий возросла на 64% (за 6 месяцев 2008 г. — 304,7 млн. руб., за 6 месяцев 2009 г. — 499,9 млн. руб.) Сумма взысканных в бюджет и обращенных в доход государства денежных средств и материальных ценностей, поставленных на учет (доочененных) объектов основных средств увеличена в 12,3 раза — 10620,6 млн. руб., в том числе взыскано денежных средств 733,4 млн. руб.

По результатам проверок к ответственности привлечено 313 правонарушителей.

Серьезное внимание уделяется межрайонным комитетом вопросам повышения эффективности работы с обращениями граждан, защите их прав и законных интересов. За истекший период 2009 г. принято 146 граждан. Проведено 14 прямых линий с жителями региона.

Активизирована совместная контрольная деятельность с правоохранительными органами и в первую очередь с Барановичским межрайонным отделом Управления департамента финансовых расследований. Так, почти 50% проведенных проверок осуществлены с участием межрайонного отдела финансовых расследований. Вскрыты факты неуплаты в бюджет налогов на сумму 89,2 млн. руб. Установлены факты выманивания кредитов, занятия безлицензионной деятельностью. По материалам проверок межрайонным отделом финансовых расследований возбуждено 12 уголовных дел.

Следует отметить, что на протяжении всего периода своего существования Барановичский межрайонный комитет государственного контроля Брестской области всегда занимал лидирующие места среди межрайонных комитетов республики. Указанная результативность достигнута благодаря слаженной работе коллектива, так как в Комитете всегда работали и работают квалифицированные кадры высокопрофессионального уровня.

**Николай ШВАЙ,
председатель Барановичского межрайонного комитета государственного контроля.**

# Ці дастаткова ў Івацэвічах будуецца жылля?

## Адказваюць жыхары Івацэвіцкага раёна



**ЮРЫЙ УЛАДЗІМІРАВІЧ**: Вы ведаеце, мне цяжка сказаць. Гэтая праблема залежыць ад наяўнасці грошай. Калі ёсць грошы, то і жыллё ў Івацэвічах набыць не праблема.



**ЯЎГЕН ІГНАЦЬЕВІЧ**: Сёння моладзі жыллё набыць складана, бо дорага, работы высокааплатнай няма. У савецкія часы было нашмат прасцей з жыллём.



**ІРЫНА ВАЛЕР’ЕЎНА**: Я сама не з Івацэвічаў, але лічу, што сёння ў горадзе набыць жыллё складана, хаця і будуецца яго даволі многа. Жыллё — дарагое.



**ТАЦЦЯНА**: Жылля ніколі не будзе будавацца столькі, каб яго хапала. Гэтая праблема будзе актуальнай увесь час. Я зараз і сама ў чарзе стаю.

Фатаграфавацца адмовіўся

**ГЕНАДЗЬ ГЕОРГІЕВІЧ**: Жыллё нібы будуецца, але як яго купіць? Крэдыты такія, што потым невядома як іх можна аддаваць, у нас жа простыя людзі столькі не зарабляюць.



**НАДЗЕЯ ВАСІЛЬЕЎНА**: Будуюць, напэўна, дастаткова і добра — цэлая вуліца будзе за касцёлам. Моладзь неяк жа бярэ крэдыты і будуецца паціху. Мо бацькі дапамагаюць?

**У народ хадзіў Павел ДАЙЛІД (фота аўтара).**

# "ВОСТОЧНОЕ ПАРТНЕРСТВО": история инициативы

**В Праге 7 мая представители 27 государств Европейского Союза и шести постсоветских стран (Армении, Азербайджана, Беларуси, Грузии, Молдовы, Украины) приняли декларацию о развитии политики "Восточного партнерства". Как известно, она была разработана на основе совместного предложения Польши и Швеции, представленного структурам ЕС в мае прошлого года. В марте нынешнего года Совет ЕС одобрил основы новой политики в отношении постсоветского пространства.**



Политика "Восточного партнерства" появилась не на пустом месте. После распада Советского Союза и образования Содружества Независимых Государств некоторые из вошедших в него стран (Украина, Молдова, Грузия) выразили намерение войти в состав ЕС. Европейские структуры и отдельные государства ЕС восприняли эти устремления без энтузиазма. В 1990-х годах и первой половине 2000-х годов Брюссель подписал со странами СНГ соглашения о партнерстве и сотрудничестве, предоставил им финансовую помощь по линии программы TACIS и расширил торговые, инвестиционные, культурные и образовательные контакты. Однако дальше этого дело не пошло.

По мнению кандидата исторических наук Александра Тихомирова, интерес к постсоветскому пространству возрос после вхождения в состав ЕС государств Центральной и Восточной Европы, которые ранее являлись частью "социалистического содружества" либо даже СССР (Литва, Латвия, Эстония). Вовлечение новых государств привело к тому, что ЕС и СНГ обрели общую границу. К тому же многие из новичков Евросоюза в условиях охватившей их эйфории стали рассматривать распространение ценностей ЕС на постсоветском пространстве в качестве своей исторической миссии.

В 2003—2004 годах Еврокомиссия разработала рамочный документ об отношениях с восточными и южными соседями ЕС и разработала конкретные планы действий для отдельных стран-соседей. В марте 2005 года верховный представитель ЕС по внешней и оборонной политике Хавьер Солана заметил, что страны — соседи ЕС, активно продвигающиеся по пути реформ, могут рассчитывать на большее сближение с Евросоюзом. Важными элементами таких реформ, по мнению Соланы, должны были стать свобода СМИ, независимая судебная система, энергичное гражданское общество, эффективное функционирование госслужб и динамичный частный сектор. Впрочем, осуществление Европейской политики добрососедства не изменило позицию европейских структур относительно возможности вхождения государств СНГ в состав ЕС.

"Восточное партнерство" не предусматривает достижения членства постсоветских государств в ЕС, хотя в декларации учредительного саммита акцентируется внимание на возможности подписания с государствами СНГ соглашений об ассоциации.

Кроме того, новая политика ЕС расширяет возможности для развития диалога между политическими элитами Евросоюза и постсоветских государств. В частности, декларация пражского саммита выражает намерение проводить раз в два года встречи глав государств и правительств и раз в год встречи министров иностранных дел государств и руководителей секторальных министерств, учредить парламентскую ассамблею "Восточного партнерства" ("Еврогнездо") и Форум гражданского общества. К участию в проектах "Восточного партнерства" могут привлекаться третьи государства, а также международные организации.

Пока сложно судить о том, насколько успешной будет новая политика ЕС.

Европейская политика добрососедства предлагает широкие возможности сотрудничества в различных областях для участвующих в ней шестнадцати стран и территорий. Её новое измерение — Восточное партнерство — распространяется на шесть стран Восточной Европы и Южного Кавказа и призвано стать ещё более реальной платформой как для двусторонних, так и для многосторонних отношений между ЕС и шестью его участниками.

**b-g.by.**

# Урад адмяніў пастанову N991

**Беларускі ўрад 4 жніўня адмяніў пастанову ад 28 ліпеня № 991 "Аб некаторых пытаннях набыцця тавараў на тэрыторыі Беларусі". Раней, у аўторак, Аляксандр Лукашэнка даручыў ураду выправіць негатыўную сітуацыю, што склалася пасля прыняцця пастановы № 991, паведаміла прэс-служба прэзідэнта.**

"Пасля вяртання прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з Кыргызстана да яго паступілі шматлікія скаргі наконт прынятай урадам пастановы № 991 "Аб некаторых пытаннях набыцця тавараў на тэрыторыі Беларусі". За растлумачэннямі гэтага рашэння Савета міністраў звярталюцца і ў Адміністрацыю кіраўніка дзяржавы", — адзначаецца ў паведамленні.

У сувязі з гэтым Лукашэнка "даручыў ураду неадкладна разабрацца і прыняць меры па выпраўленні наяўнай негатыўнай сітуацыі". У выніку пастанова была адменена.

"Беларускі ўрад апынуўся ў не зусім зручнай сітуацыі. Яшчэ ўчора і сёння раніцай нам даказвалі перавагі дакумента, але ўжо к вечару яго адмянілі. Цяпер беларускі бізнес можа ўздыхнуць свабодна", — гаворыцца ў каментары "Панарамы".

3 жніўня міністр эканомікі Мікалай Зайчанка назваў пастанову "антыкрызіснай мерай".

"Гаворачы аб мэце прыняцця гэтай пастановы ўрада, я перш за ўсё хацеў бы адзначыць, што гэтую пастанову трэба разглядаць як антыкрызісную меру, — заявіў Зайчанка. — Гэта значыць, у нас сёння істотна абвастрыліся праблемы на ўнутраным рынку, калі дастаткова вялікая колькасць пасрэднікаў прапаноўваюць тавар, які прайшоў некалькі ступеняў адзін ад аднаго, і адны і тыя ж суб'екты гаспадарання набываюць тавар па розным кошце. Таму, каб прывесці да адзінага парадку таварныя патокі на нашым рынку, вось гэта, я б сказаў, асноўная мэта прыняцця гэтай пастановы".

4 жніўня на пасяджэнні прэзідыума Савета міністраў прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі даручыў унесці "некаторыя карэкціроўкі" ў пастанову.

Паводле яго слоў, пастанова № 991 рэгулюе вытворча-гаспадарчую дзейнасць толькі дзяржпрадпрыемстваў і ААТ з доляй дзяржавы ў статутным фондзе.

Дакумент, які набыў моц 1 жніўня, выключаў пасрэднікаў з працэсу рэалізацыі юрыдычным асобам айчынных і імпартных тавараў на тэрыторыі Беларусі. Згодна з пастановай юрасобы павінны набываць тавары толькі ў тых пастаўшчыкоў, якія з'яўляюцца вытворцамі, або іх афіцыйных гандлёвых прадстаўнікоў. Пералікі такіх прадстаўнікоў павінны былі зацвярджацца рэспубліканскімі і мясцовымі органамі дзяржкіравання па ўзгадненні з віцэ-прэм'ерамі, якія курыруюць адпаведныя сферы эканомікі. Для ўключэння ў пералік афіцыйных гандлёвых прадстаўнікоў неабходна было прадставіць эканамічнае абгрунтаванне набыцця тавараў у пастаўшчыка.

Пастанова выклікала рэзкую крытыку прадстаўнікоў бізнес-супольнасці, якія запатрабавалі ад урада адмены гэтага дакумента.

**БелаПАН.**

# Абітурыенты сталі студэнтамі

**На дзённую бюджэтную форму навучання ў БДУ залічана 1 тыс. 995 студэнтаў.**

**Як паведаміла прэс-служба ВНУ, без экзаменаў залічана 168 пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд, лаўрэатаў спецыяльных фондаў прэзідэнта (у 2008 годзе —123). Сярод залічаных 20% скончылі школу з залатым ці срэбным медалём, 56% скончылі ліцэі і гімназіі (у 2008 годзе адпаведна 15% і 44%).**



Конкурс абітурыентаў на дзённую бюджэтную форму навучання ў цэлым па ВНУ склаў 2,3 чалавека на месца. Самы высокі конкурс зарэгістраваны на спецыяльнасці "дызайн (накірунак — камунікатыўны дызайн)" — 17 чалавек на месца.

Добрыя вынікі ва ўступнай кампаніі паказалі выпускнікі сельскіх школ, адзначаецца ў паведамленні прэс-службы. Сёлета 36% абітурыентаў залічана па аб'яднаным конкурсе: у сельскіх абітурыентаў быў вышэйшы прахадны бал, чым у гарадскіх. Гэта характэрна для геаграфічнага, гістарычнага, фізічнага факультэтаў, факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, а таксама для большасці спецыяльнасцей філалагічнага факультэта.

Кожны трэці студэнт першага курса БДУ набраў больш за 300 балаў. Сярод прыродазнаўчых спецыяльнасцей самы высокі прахадны бал —358— зарэгістраваны на спецыяльнасці "камп'ютэрная бяспека" факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі (у 2008 годзе —352). Сярод гуманітарных спецыяльнасцей самы высокі прахадны бал —353 — на спецыяльнасці "інфармацыя і камунікацыя" факультэта філасофіі і сацыяльных навук (у 2008 годзе — 344). Сярод эканамічных спецыяльнасцей — 357 —на спецыяльнасці "сусветная эканоміка" (у 2008 годзе — 344).

Сярод спецыяльнасцей з творчым конкурсам самы высокі прахадны бал на спецыяльнасці "дызайн (напрамак — камунікатыўны дызайн)". Ён склаў 41,2 з магчымых балаў. У лік гэтых балаў уваходзяць: сярэдні бал атэстата, два сертыфікаты цэнтралізаванага тэставання па 10-бальнай сістэме і дзве адзнакі за творчыя ўступныя іспыты, таксама злічаныя па 10-бальнай сістэме.

**БелаПАН.**

# Адмена пастановы не кампенсуе ўрону, нанесенага інвестыцыйнаму іміджу краіны

**Адмена скандальнай пастановы ўрада № 991 "Аб некаторых пытаннях набыцця тавараў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь" не кампенсуе ўрону, нанесенага ёй інвестыцыйнаму іміджу краіны. Такое меркаванне ў інтэрв'ю БелаПАН выказаў кіраўнік аргкамітэта па стварэнні Асацыяцыі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва Сяргей Балыкін.**



"Беспрэцэдэнтнае абмежаванне пасрэдніцкай дзейнасці, сама працэдура прыняцця дакумента — ціхая і непрыкметная, увядзенне яго ў сілу без суправаджальных дакументаў і наяўнасць у ім яўных прыкмет парушэння ўсіх прынцыпаў заканадаўчай тэхнікі, эканамічнай мэтазгоднасці і грамадскай маралі наглядна прадэманстравалі адсутнасць у Беларусі стабільнасці і прадказальнасці", — заявіў эксперт.

Паводле яго слоў, прэзідэнт, які ўмяшаўся ў ход падзей, у чарговы раз выступіў у ролі абаронцы і ратавальніка".

"Адзінае, што прапусціў Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з візітам у Кыргызстан, — гэта хвалю абурэння дзелавой супольнасці", — заявіў эксперт.

Балыкін адзначыў, што ў цывілізаванай дзяржаве ў такіх выпадках урад падае ў адстаўку.

"Зразумела, прэзідэнт можа наладзіць чарговую публічную лупцоўку ўрада цалкам і прэм'ера ў прыватнасці, звольніць іх і нават рэпрэсаваць, аднак сітуацыю з інвестыцыйным іміджам гэта ўжо не выправіць", — мяркуе эксперт.

Ён выказаў задавальненне "рэакцыяй дзелавой супольнасці". "Вельмі важна, што яна праявіла салідарнасць, змагла выпрацаваць узгодненую жорсткую пазіцыю і самае галоўнае — не пабаялася адстойваць яе да канца. Магчыма, мы бачым цяпер нараджэнне нейкай сілы, здольнай адстойваць інтарэсы бізнесу", — сказаў Балыкін.

Эксперт заклікаў бізнес-супольнасць не расслабляцца ў сувязі з адменай пастановы №991. "У будучыні нельга выключаць з'яўлення новых скандальных дакументаў", — заявіў ён.

**БелаПАН.**

# РОД ДЗЯКОНСКІХ

## і іх маёнткі на Брэстчыне ў XIX — XX стст.

**Менавіта пад такой назвай на мінулым тыдні ў брэсцкім выдавецтве "Альтэрнатыва" выйшла кніга кандыдата гістарычных навук, дацэнта кафедры філасофіі і культуралогіі Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта Вольгі Папко. З гэтай нагоды, як кажуць, па гарачых слядах, у пятніцу, 24 ліпеня, у музеі-сядзібе "Пружанскі палацык" адбылася прэзентацыя гэтага краязнаўчага выдання.**

**Шмат сабралася аматараў гісторыі краю ў гэты раз ў "палацыку" — гэтае прывабнае выданне сапраўды зацікаўлівае сваёй навізной, адчыняе новую старонку ў накірунку вывучэння гістарычнай спадчыны. Думаю, што гэтая кніга — своеасаблівы пачатак нізкі выданняў пра вядомыя прозвішчы берасцейскай шляхты, такі добры прыклад астатнім краязнаўцам рэгіёну. Увогуле, няшмат існуе такіх даследаванняў і ва ўсёй Беларусі. А менавіта такая шляхта складала большасць, яна рабіла гісторыю, вызначала лёс уніяў і паўстанняў.**



Выступае Вольга Папко.




Вокладка кнігі пра род Дзяконскіх.

Праводзячы свае даследаванні, Вольга Папко вывучала архівы Гродна, Мінска, Брэста, вяла перапіску з апошнімі нашчадкамі Дзяконскіх, якія раскіданыя па ўсім свеце. Першая спроба выдалася вельмі ўдала — у чытача складваецца даволі яркая і падрабязная карціна пра Дзяконскіх, іх жыццё і дзейнасць. У сваёй кнізе Вольга Мікалаеўна адкрывае нам новыя імёны берасцейскіх знакамітасцей — і гэта ўжо вартая праца.

Дырэктар музея Юрый Зялевіч зазначыў на прэзентацыі: "Выяўленне такіх вядомых людзей, якія праславілі наш край далёка за яго межамі, — адзін з галоўных накірункаў работы краязнаўцаў!" І далей: "Менавіта такім чынам у гэтым годзе супрацоўнікі музея шчыльна падыйшлі да названай праблематыкі: на сённяшні дзень вядома ўжо больш за 250 імёнаў землякоў — вядомых дзяржаўных і грамадскіх дзеячоў, літаратараў, мастакоў, навукоўцаў. Намі рыхтуецца да выдання краязнаўчы даведнік пра вядомых лю-дзей Пружанскага краю." Дырэктар музея звярнуўся за дапамогай да ўсіх, каму неабыякава гісторыя, дапамагчы з пошукам такіх вядомых лю-дзей, дзеля чаго ў бліжэйшы час паабяцаў апублікаваць прыкладны спіс "знакамітасцей".

Павіншаваць з першавыданнем прыехаў на імпрэзу і вядомы краязнаўца з Баранавічаў Міхась Маліноўскі. Ён выказаў словы ўдзячнасці аўтарцы і падарыў падборку сваіх апошніх выданняў.

Не абышлося і без музычных падарункаў, якія падрыхтавала Святлана Рыбінская, выкладчыца Пружанскай дзіцячай школы мастацтваў імя Рыгора Шырмы.

Напрыканцы трэба не абмінуць той прыемны факт, што менавіта ў гэты дзень Вольга Папко адзначала свой дзень нараджэння, таму шматлікія віншаванні датычыліся і гэтай светлай падзеі. Гэты дзень нараджэння яна запомніць на ўсё жыццё.

А нам застаецца таксама далучыцца да віншаванняў з пажаданнямі моцнага здароў'я і новых даследаванняў і адкрыццяў.

●

Упершыню Дзяконскія з'яўляюцца на Брэстчыне ў пачатку XIX ст. Яны былі ўладальнікамі маёнткаў Чахец, Анапаль, Магілёўцы і некаторых іншых, рэшткі пабудоў якіх захаваліся ў вёсках Пружанскага раёна. У Магілёўцах уцалеў вялікі сядзібны дом, у якім зараз месціцца абласная псіхіятрычная бальніца.

